УДК 930. 1 (476)

А.Л. Дзядзінкін

# Нацыянальная палітыка савецкай улады на Беларусі ў міжваенны перыяд (айчынная гістарыяграфія 90-х гг. XX – пачатку XXI стст.)

У 90-я гады XX – пачатку XXI ст. у гістарычнай навуцы вывучаліся розныя аспекты нацыянальнай палітыкі савецкай улады – сацыяльна-эканамічны, культурна-асветніцкі, этнаканфесійны. Найбольш актуальным на сучасным этапе з'яўляецца даследаванне нацыянальных працэсаў міжваеннага перыяду, бо па-першае, сістэмы грамадскага развіцця 20-х і 90-х гадоў XX ст. маюць шмат агульных рыс – набыццё дзяржаўнага суверэнітэту, спробы нацыянальнага адраджэння, дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця. Па-другое, карысна выкарыстаць і ўрокі 30-х гг. XX ст., каб улічыць гістарычны вопыт пры распрацоўцы прынцыпаў сучаснай нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

Належнае месца аналізу нацыянальнай палітыкі савецкай улады на Беларусі адведзена ў комплексных навукова-папулярных і вучэбных выданнях па гісторыі [1-3]. Так, у другой частцы «Нарысаў гісторыі Беларусі» вылучаецца асобны параграф «Спроба нацыянальна-культурнага адраджэння. Палітыка беларусізацыі». У манаграфіі на падставе архіўных матэрыялаў даследуюцца перадумовы і прычыны правядзення беларусізацыі, характарызуюцца практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню нацыянальнай палітыкі ў 20-я гады XX ст. Разам з тым перыяд 30-х гадоў у рабоце практычна не разгледжаны, за межамі даследавання засталася і праблема нацыянальна-культурнага адраджэння нетытульных этнічных супольнасцей на Беларусі.

У другой частцы «Гісторыі Беларусі» пад рэдакцыяй Я. Новіка і Г. Марцуля, па-першае, разгледжаны асноўныя накірункі і вынікі беларусізацыі; па-другое, вызначаны характар мерапрыемстваў Савецкай улады ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Асноўнай думкай даследавання з'яўляецца меркаванне, што палітыка беларусізацыі прадугледжвала нацыянальнае адраджэнне ўсіх этнічных груп Беларусі. Нацыянальная палітыка 30-х гадоў XX ст. не з'яўлялася аб'ектам дадзенага даследавання. Даследчыкі Л. Лыч і У. Навіцкі ў рабоце «Гісторыя культуры Беларусі» значную ўвагу ўдзялялі праблеме паслярэвалюцыйнага нацыянальнага развіцця. Акрамя даследавання асноўных аспектаў беларусізацыі ў манаграфіі вывучаецца развіццё культуры нацыянальных меншасцей. Аўтары характарызуюць работу нацыянальных школ, бібліятэк, клубаў. Навукоўцы паспрабавалі даць агульнае ўяўленне пра наступ таталітарнага рэжыму на палітыку беларусізацыі ў пачатку 30-х гадоў XX ст., аднак пры характарыстыцы становішча нацыянальных меншасцей у вызначаны перыяд даследчыкі абмежаваліся заўвагай пра тыповыя працэсы ў культурным развіцці ўсіх этнічных супольнасцей Беларусі.

Шэраг навукоўцаў (М. Бандарэнка, Г. Жылінскі, І. Каляда. Л. Лыч, А. Зельцэр, А. Кароль, Т. Баталка і іншыя) займаюцца вывучэннем непасрэдна бела-

русізацыі як аднаго з накірункаў нацыянальнай палітыкі бальшавікоў. Так, у даследаваннях Л. Лыча [4-5] асвятляецца месца КП(б)Б у вызначэнні курса па ажыццяўленню нацыянальнай палітыкі, вывучаецца роля асобных грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, намаганнямі якіх праводзілася беларусізацыя. Аўтар справядліва зазначае, што барацьба з «нацдэмаўшчынай» толькі запаволіла беларусізацыю, але не спыніла гэты працэс. Праўда, як і ў большасці іншых даследаванняў, аналіз нацыянальнай палітыкі 30-х гадоў XX ст. даецца ў рабоце схематычна, нацыянальныя працэсы другой паловы вызначанага перыяду ўвогуле не разглядаюцца.

У артыкуле А. Караля «Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння» [6] адным з тэзісаў выступае меркаванне, што першая хваля беларусізацыі звязана з дзейнасцю БНР. Аўтар падрабязна асвятляе, як выпрацоўвалася, набывала канцэптуальную цэласнасць палітыка бальшавікоў у галіне нацыянальных адносін. Пры ўсім гэтым перыяд 30-х гадоў XX ст. аўтар не разглядае і лічыць разгром беларускага «нацыянал-дэмакратызму» завяршальным этапам беларусізацыі.

Даследчык І. Каляда [7] разглядае беларусізацыю партыйна-дзяржаўнага апарату, аналізуе нацыянальную палітыку Савецкай улады ў галіне асветы, адукацыі і культуры. Аўтарам зроблены вывад, што ў канцы 1920-х гадоў пачалося адступленне ад зыходных прынцыпаў беларусізацыі, што знайшло адлюстраванне ў скарачэнні колькасці беларусаў у кіруючых органах, пераводзе дзейнасці школ і культурна-асветніцкіх устаноў з беларускай на рускую мову, змяншэнні тыражоў беларускамоўных выданняў. У выніку, на думку даследчыка, у 1930 годзе пачалася контрбеларусізацыя. Нацыянальную палітыку 30-х гадоў XX ст. аўтар не даследуе, хаця і зазначае, што гэта быў час сур'ёзнай дэфармацыі ў нацыянальна-культурнай палітыцы.

А. Зельцэр [8] пры аналізе вызначанай праблемы, па-першае, ахарактарызаваў асноўныя задачы нацыянальнай палітыкі Савецкай улады, а па-другое, на аснове архіўных матэрыялаў патлумачыў прычыны неадназначнай рэакцыі насельніцтва на правядзенне беларусізацыі (як спачуванне палітыцы, так і адкрытае супраціўленне ёй). Слушнай з'яўляецца думка аўтара, што поспехі беларусізацыі партыйна-дзяржаўнага апарату залежалі ад ступені тэрытарыяльнай аддаленасці ад Мінска (г. зн., чым далей ад цэнтра, тым меншым быў працэнт беларусізацыі).

У даследаванні А. Вялікага [9] асноўная ўвага сканцэнтравана на вызначэнні прычын правядзення Савецкай уладай беларусізацыі. Аўтар падкрэсліў, што найбольш важным у першай палове 20-х гадоў з'яўляецца знешнепалітычны фактар, які прымушаў бальшавікоў пэўным чынам мяняць сваё рэнамэ ў вачах Захаду (гэта датычылася і нацыянальнай палітыкі, дзе Савецкая ўлада дэкларавала дэмакратычны прынцып «нацыянальнага самавызначэння», які трэба было рэалізоўваць на практыцы).

Тэмай даследавання Т. Баталкі з'яўляецца «Будаўніцтва беларускай нацыянальнай школы ва ўмовах палітыкі беларусізацыі» [10]. У працы разглядаецца сувязь адраджэнскіх працэсаў пачатку XX ст. з распрацоўкай Савецкай уладай палітыкі ў галіне асветы. Вывучэннем культурна-асветніцкага аспекта беларусізацыі таксама займаюцца Р. Брэнько, Г. Жылінскі, А. Зелянкова, У. Тугай. М. Бандарэнка разглядае ажыццяўленне беларусізацыі ў часцях Чырвонай Арміі, што дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі. А. Хоціна выказвае свае меркаванні да пытання аб канцэпцыі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў 20-ыя – 30-ыя гады XX ст і яго перыядызацыі.

Што датычыцца спецыяльных даследаванняў па праблеме нацыянальнай палітыкі Савецкай улады ў адносінах да тытульнага этнасу Беларусі ў 30-я гады, то акрамя артыкула Л. Лыча «Беларусізацыя 30-х, то варта адзначыць

работу У. Калесніка «Контрбеларусізацыя» [11]. Праўда, аўтар разглядае толькі самы пачатак згортвання беларусізацыі і канцэнтруе ўвагу на такім яе аспекце, як арышты па справе «Саюз вызвалення Беларусі». Даволі змястоўны артукул У. Калесніка ўтрымлівае дакладныя звесткі са следчых дакументаў, аднак аўтарам не зроблены тэарэтычныя абагульненні па праблеме.

Даволі шырокая група даследчыкаў займаецца праблемамі развіцця нацыянальных меншасцей на Беларусі ў 20- 30-я гады XX ст. [6]. Безумоўна, спрыяла гэтаму прыняцце Закона «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» (1990 г.), стварэнне Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур (1994), Каардынацыйнага Савета па справах нацыянальных меншасцей пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (1995).

Вывучэннем этнічнага развіцця латышскай нацыянальнай супольнасці на Беларусі займаюцца В. Лукін, У. Тугай, М. Пархімовіч, І. Карашчанка. Аўтары навуковых работ даследавалі сацыяльна-эканамічнае, палітычна-прававое і духоўнае развіццё вызначанай этнічнай групы, на аснове архіўнага матэрыялу паказалі асаблівасці нацыянальнай палітыкі Савецкай улады ў адносінах да латышоў.

Беларускімі палякамі ў 90-я гады XX – пачатку XXI ст. займаюцца пераважна Р. Лазько, У. Тугай, В. Акуневіч, А. Вялікі, Т. Тарасевіч. Вывучаецца дзейнасць польскіх нацыянальных Саветаў на Беларусі, разглядаюцца асноўныя этапы нацыянальнай палітыкі Савецкай улады ў адносінах да палякаў, даецца аналіз прычын міжнацыянальнай напружанасці ў асяроддзі сумеснага пражывання беларусаў і палякаў.

Даследчыкі Э. Іофе, Л. Смілавіцкі, І. Сосіс, Л. Шкуцько, І. Герасімава, І. Куркоў, А. Скір аналізуюць розныя бакі грамадскага і культурнага жыцця яўрэйскай этнічнай супольнасці на Беларусі. Па-першае, даследуецца развіццё сістэмы нацыянальных школ і прафесійна-тэхнічных устаноў; па- другое, вывучаецца лёс іудаізму ў БССР; па-трэцяе, разглядаюцца асноўныя дасягненні ў духоўнай культуры яўрэйскай супольнасці; па-чацвёртае, даследуюцца працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця вызначанай этнічнай групы.

Некаторыя звесткі пра нацыянальна-культурную работу ў асяроддзі цыганскага насельніцтва ў 20-30-я гады XX ст. маюцца ў артыкулах В. Калесніка, М. Маліноўскага, Л. Этэнка, А. Соніча, Т. Буйко. Работы маюць навуковапапулярны характар пераважна без апоры на архіўны матэрыял. Прыблізна такія ж вывады можна зрабіць, калі прааналізаваць работы беларускіх аўтараў, прысвечаныя вывучэнню этнакультурнага развіцця татар Беларусі. У гэтым накірунку працуюць С. Думін, І. Канапацкі, А. Радкевіч, А. Александровіч. У апошняе дзесяцігоддзе актывізавалася ўвага даследчыкаў да вывучэння этнічнага развіцця немцаў на Беларусі, на падставе архіўных матэрыялаў разглядаюцца міжнацыянальныя адносіны ў асяроддзі сумеснага пражывання беларусаў і немцаў. Сярод даследчыкаў, якія займаюцца вызначанай праблемай, можна назваць У. Тугая, А. Ермаловіча, В. Пігунова, А. Дзядзінкіна, В. Чаркасаву. Значна менш сучасныя даследчыкі займаюцца аналізам становішча іншых этнічных супольнасцей на Беларусі. Нацыянальнай палітыкай Савецкай улады ў адносінах да рускай супольнасці займаюцца Г. Каспяровіч, П. Церашковіч, праблемамі развіцця літоўскай этнічнай групы цікавіцца У. Тугай.

Адзінай комплекснай работай па праблеме развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі з'яўляецца даследаванне Э. Дубянецкага «Міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў 20-я гады XX ст.» [12]. У рабоце значнае месца ўдзяляецца вывучэнню прычын і праяў міжнацыянальнай напружанасці ў шматэтнічным рэгіёне, што ў беларускай гістарычнай навуцы ўвогуле доўгі час не даследавалася. Аднак, як бачна, перыяд 30-х гадоў XX ст. у рабоце не закранаецца, таму карціна правядзення нацыянальнай палітыкі ў міжваенны перыяд

становіцца не поўнай. Па перыяду 1930-х гадоў фактычна адзінай публікацыяй комплекснага характару можна лічыць артыкул В. Жука і А. Мікулы «Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцяў на Беларусі ў часы яжоўшчыны» [13]. На аснове архіўнага матэрыялу прыводзяцца звесткі пра арышты палякаў, латышоў, немцаў, якіх абвінавачвалі ў палітычным шпіянажы. Значным дасягненнем беларускай навукі ў галіне вывучэння этнакультурнага развіцця нацыянальных меншасцей з'яўляецца краязнаўчая работа В. Пічукова і М. Старавойтава «Гомельщина многонациональная» [14].

Як бачна, вывучэннем асобных аспектаў нацыянальнай палітыкі Савецкай улады на Беларусі займаецца даволі вялікая група даследчыкаў. Тым не менш, можна зрабіць выснову пра адсутнасць у беларускай гістарычнай навуцы комплекснага даследавання па вызначанай тэматыцы. Па-першае, недастаткова вывучана нацыянальная палітыка Савецкай улады ў 30-я гады XX ст. (як у адносінах да нацыянальных меншасцей, так і да тытульнай супольнасці). Па- другое, сучасны стан вывучэння названай тэмы сведчыць пра неабходнасць комплекснага разгляду нацыянальнай палітыкі Савецкай улады ў адносінах да тытульнай этнічнай групы (беларусаў) і нацыянальных меншасцей (яўрэяў, латышоў, літоўцаў, палякаў, цыган, татар, рускіх). Толькі ў такім выпадку можна аднавіць аб'ектыўную карціну ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі Савецкай улады на Беларусі ў міжваенны перыяд.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Гісторыя Беларусі***: У дзвюх частках / Пад рэдакцыяй ***Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля***. Ч. 2. Мн., 1998. С. 98.
2. ***Лыч Л., Навіцкі У.*** Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996. С. 96.
3. ***Нарысы гісторыі Беларусі***: У дзвюх частках. Ч. 2. Мн., 1995. С. 87.
4. ***Лыч Л.*** Беларусізацыя 20-х // Маладосць, 1995, № 11. С. 187-211.
5. ***Лыч Л.*** Беларусізацыя 30-х // Маладосць, 1995, № 12. С. 116-130.
6. ***Кароль А.*** Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння // Крыжовы шлях. Мн., 1993. С. 118-164.
7. ***Каляда І.*** Беларусізацыя: шляхі і метады ажыццяўлення. Мн., 1997.
8. ***Зельцэр А.*** Белоруссизация 20-х: достижения и неудачи // Евреи Беларуси. История и культура. Вып. 3-5. Мн., 1998. С. 60-86.
9. ***Вялікі А.*** «Чырвоная беларусізацыя» // Спадчына, 2000, № 1. С. 17-35.
10. ***Баталка Т.*** Нацыянальная палітыка ў галіне народнай асветы // Веснік БДУ. Сер. 3. Гісторыя, філасофія, эканоміка, права, 1991, № 2. С. 13-14.
11. ***Калеснік У.*** Конрбеларусізацыя // Спадчына, 1992, № 4. С.42-49.
12. ***Дубянецкі Э.С.*** Міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў 20-я гг. XX ст. Аўтарэф. дыс. ...канд. гіст. навук. Мн., 1995.
13. ***Жук В., Мікула А.*** Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцяў на Беларусі ў часы яжоўшчыны // Беларусь: гістарычны лёс, народы і культура. Мн., 1995. С. 197-199.
14. ***Пичуков В.П., Старовойтов М.И.*** Гомельщина многонациональная. Гомель,1999.С. 19.



*S U M M A R U*

*In time the work was analysised history oj the national politics of the Soviet power in Belarus (1917-1939). The author decided thaf in the first place in modern historical science absent fundamental analysis on the corresponding problem and in the second place national precesses in general hot studied in 30-th years of the 20 century.*

*Therefore, the work out problem the national treatments is actual on modern stage.*


*Поступила в редакцию 8.04.2002*